***Выкарыстанне патэнцыялу культурных і духоўна-маральных традыцый беларускага народа ў выхавaучым працэсе***

*Волчак Г. В, классны кіраўнік VII «Б» класса*

На сучасным этапе, адным з важнейшых падыходаў у выхаваўчым працэсу з'яўляецца сацыякультурны, які вызначаецца прызнаннем і асэнсаваннем нацыянальна-культурных традыцый, адраджэннем і развіццём культуры свайго народа, фарміраваннем нацыянальнай самасвядомасці.

Як настаўніца роднай мовы і літаратуры, я маю цудоўную магчымасць уводзіць у свет мастацкага летапісу жыцця беларускага народа, выхоўваць на прыкладзе герояў высокамастацкіх твораў любоў да сваёй зямлі, павагу да людзей, адданасць усяму роднаму, гатоўнасць да самаахвярнасці.

Вялікага напружання патрабуюць ад мяне мерапрыемствы, на якіх адбываецца дыялог аб духоўнасці, подзвігу і здрадзе, велічы і маладушнасці. Тут не скажаш, як на ўроку мовы: "Не, сябры, вы памыліліся, гэта не дапаўненне, а азначэнне." На жаль, сёння мы маем нямала прыкладаў таго, як некаторыя блытаюць добрае з дрэнным, пачварнае прымаюць за прыгожае, вартае захаплення і пераймання.

Родная зямля … Яна ў "Слове аб палку Ігаравым", у творах К. Чорнага, І. Мележа, У. Караткевіча, В. Адамчыка. Іх героі змагаюцца за зямлю, мараць аб ёй, з любоўю і павагаю ставяцца да яе. На зямлі мы жывём, яна нас корміць. Абыякавасць да зямлі , наогул да ўсёй прыроды прывяла да таго, што не так часта, як бывала, раней, убачыш трохкутнікі журавоў у небе, здаецца паменшала нават жаваранкаў, памялелі рэкі. Гэты сумны пералік можна працягваць. Гэту праблему мы не павінны змоўчваць, хаваць ад дзяцей. Ім жа працягваць нашы справы. Якімі яны стануць – Іванамі Бяспамятнымі ці ўлюбёнамі ва ўсё роднае, клапатлівымі Янкамі, Алесямі? Кажуць, што кропля дробіць камень не сілай, а частым паданнем. І калі дзень за днём, урок за урокам вучань будзе чуць пра добразычлівасць, адказнасць перад бацькамі, пашану да ветэранаў, аддасць роднай зямлі, бачыць гэтаму шматлікія прыклады з боку дарослых, у душы яго прарасце парасткамі пачуццё нацыянальнай самасвядомасці.

Узгадваю, як Маленькі прынц, герой аднайменнай казкі французкага пісьменніка Экзаперы, спытаў у кветкі: "Дзе ж людзі?" і пачуў у адказ:"Іх носіць ветрам. У іх няма каранёў.. Так, сапраўды, быць без каранёў, непаважна ставіцца да людзей, да матчынай мовы, да сваёй спадчыны – значыць быць безаблічным, не мець будучыні. Ці не адсюль нашы вечныя праблемы?

На чым жа выхоўваць сучасных дзяцей? Пагодзімся, што нідзе так поўна выяўляецца душа і характар народа, як у фальклоры, традыцыях, абрадах. Лічу, што спадчыннае, народнае, мудрае дапаможа маладым стаць духоўна багатымі. І разам з тым, гэта ўнікальны матэрыял, у якім адлюстравана народная педагагічная культура.

У гэтым я пераканалася не аднойчы пад час правядзення розных мерапрыемстваў. Упэўнена, што на прыкладах народнай педагогікі беларусаў можна выхаваць у вучняў станоўчыя адносіны да працы, патрыятызм, грамадзянскасць.

Наша Беларусь — старонка з багатай гісторыяй, самабытнай культурай, вялікай духоўнай спадчынай. Спадчынай, якая сёння, на жаль, у многім забыта, але якая ўсё роўна жыве і сілкуе народ, бо ўжо закладзена ў яго генетычны код. І наколькі важна прывіць дзіцяці пачуццё Радзімы — зямлі, на якой яно нарадзілася, якая дала яму жыццё і ўсё тое, што набыта і адпрацавана ў мінулым яго продкамі, навучыць з пашанай ставіцца да сям'і і роду, да сваёй малой і вялікай Радзімы.

**Слайд 2** У апошнія гады у нас адзначылася пэўная станоўчая тэндэнцыя да свайго мінулага, гісторыі і культуры, у тым ліку і да нацыянальных традыцый. <u>Як сказаў Ніл Гілевіч:</u>

Мы ўзышлі не з насення,
што ветрам занесена,
Мы не дзікай травы
самарослыя парасткі.
У глыбінях зямлі,
гераічнай і песеннай,
Нашых душ карані –
з вузялкамі ўпартасці.

Культурны і адукаваны чалавек, наш сучаснік і суайчыннік, у тым ліку вучань сёння паварочваецца да мінулага, праяўляе жаданне ведаць звычаі, абрады, традыцыі свайго народа, цікавіцца ўзорамі нацыянальнага беларускага адзення, нацыянальнай кухняй, разнастайнымі тэхнікамі ткацтва, вышыўкай, побытам беларускага народа. Трэба толькі ўмела яму дапамагчы і накіраваць справу ў патрэбнае русла.

Прааналізаваўшы ўсё сказанае, улічыўшы той факт, што каму, як не мне, выкладчыку роднай мовы і літаратуры, гэта наканавана лёсам і прафесіяй прапагандаваць і вывучаць спадчыну беларусаў, я мэтанакіравана абрала прыярытэтным накірункам уласнай дзейнасці як класнага кіраўніка справу далучэння маіх выхаванцаў да нацыянальнай культуры і традыцый беларускага народа і вызначылася з мэтай: ствараць неабходныя ўмовы для фарміравання ў выхаванцаў павагі да нацыянальнай спадчыны беларусаў, пачуцця нацыянальнага гонару і патрыятызму.

<u>**Слайд 3.** Асноўныя задачы:</u>

- паглыбіць уяўленні і веды пра нацыянальную спадчыну беларусаў;
- садзейнічаць станаўленню ўстойлівай цікавасці і павагі да народнай спадчыны;
- спрыяць развіццю сацыяльных грамадска-патрыятычных пачуццяў і нацыянальнай самасвядомасці сродкамі краязнаўства;
- актывізаваць патрэбнасць вучняў у захаванні і перадачы іншым пакаленням нацыянальных, духоўных і культурных каштоўнасцей;
- матываваць дзяцей да праяўлення нацыянальнага самавыражэння;

- стварацъ умовы для фарміравання светапогляду вучня на аснове павагі да працы і чалавека-працаўніка.

Для дасягнення пастаўленай мэты і вырашэння сфармуляваных задач выкарыстоўваліся наступныя формы, метады і прыёмы працы:

- назіранне;
- апытванне (анкетаванне вучняў і сем’яў);
- праца з друкаванымі крыніцамі і экспанатамі;
- пошукавая работа (збор экспанатаў для выставы);
- выстава сабранага матэрыялу: “ Бабулін ручнік”
- гутаркі з носьбітамі фальклору і народных традыцый;
- фальклорныя святы, конкурсы, гульні: “Каляды”, “Піліпаўскія вячоркі”,“Наш край багаты на нацыянальныя святы”, “Купальскі карагод”, “Беларускія гаспадыні”…
- віктарыны і інтэлектуальныя гульні: “Нацыянальныя традыцыі беларусаў”, “Вандроўка па старонках гісторыі”
- віртуальнае падарожжа: “Мая маленькая радзіма”; літаратурна-этнаграфічная гасцёўня: “Ой, лянок, лянок..!”

Выхаванне пачуцця патрыятызму і грамадзянскасці пачынаецца з любові да сваёй сям’і, дома, двара, вуліцы, школы. Як вялікая рака бярэ пачатак з маленькіх крыніц, так і любоў да Радзімы і народа пачынаецца з ведаў аб роднай гісторыі, культуры, з прыхільнасці да ўсяго роднага, што створана пакаленнямі, з цікавасці да людзей і іх працы. Няма ніводнага горада ці вёскі, з якіх не выйшлі б вядомыя людзі, дзе не захоўваюцца значныя з гістарычнага пункту гледжання прадметы, помнікі, створаныя папярэднімі пакаленнямі. Усё гэта – наша спадчына, нашы нацыянальныя традыцыі, якія трэба ведаць і імкнуцца перадаць у будучым нашчадкам. У чым бачыцца мне карысць такой працы? Заўважце, дзякуючы вывучэнню народных традыцый, вучні не толькі набываюць веды пра свой народ, яго паходжанне, гістарыю, яны знаёмяцца з адметнымі рысамі і характарам беларусаў. Праз усё гэта прыходзіць да дзяцей разуменне, што беларус – гэта вялікі міралюб, ашчадны і талерантны чалавек і заўзяты працаўнік. Выхаванне на прыкладзе нацыянальных беларускіх традыцый дапамагае дзецям усведамляць, што лепшыя якасці беларуса, яго этнічныя рысы шліфаваліся на працягу многіх стагоддзяў і дайшлі да нашага часу як неацэнны наш нацыянальны скарб, які мы павінны зберагчы і памнажыць.

Мая задача актывізаваць працу па далучэнні і знаёмстве школьнікаў з абрадамі і традыцыямі нашых продкаў. З уласнага вопыту скажу, што праходзіць у нашым калектыве названая дзейнасць праз падрыхтоўку і правядзенне розных мерапрыемстваў, скіраваных на вывучэнне фальклору і побыту продкаў-беларусаў. Напрыклад, святкаванне народнага свята “Вялікдзень”, “Каляды” і іншых дазваляе вучням праявіць сябе не толькі кемлівымі гаспадарамі, працавітымі майстрамі простых рэчаў, але і цудоўнымі выканаўцамі народных песень, карагодаў, дужымі асілкамі ў беларускіх народных гульнях і таленавітымі жартаўнікамі ў бясконцых народных прыказках і прымаўках, загадках. Пры правядзенні гэтых мерапрыемстваў

вялікая дапамога аказваецца сем’ямі вучняў, яны непасрэдныя ўдзельнікі свят побач са сваімі дзецьмі-вучнямі. З вялікім задавальненнем выхаванцы ўдзельнічаюць у народных гульнях. Знаёмства з традыцыямі нашага народа не абмяжоўваецца толькі святкаваннем народных свят. Ладзяцца выставы прадметаў побыту беларуса і народных вырабаў: “ Матулін ручнік”, “Бабулін куфэрак”. Папулярны вусны часопіс “Ад прадзедаў спакон вякоў…”. Радзіма для дзяцей пачынаецца з сям'і. Фарміраванне духоўнага вобліку дзіцяці ў сям’і павінна быць скіравана і праходзіць у атмасферы культу роду, сярод партрэтаў продкаў, радаводаў, паданняў пра славутую даўніну, экспанатаў, што звяртаюцца з мінуўшчыны да сучасніка і спрыяюць выхаванню пачуцця гонару за сваю нацыю і свой народ. Бацькі з першых крокаў дзіцяці павінны прывіваць яму любоў і павагу да роднай зямлі, людзей, што жывуць і жылі на ёй. А асабісты прыклад бацькоў не можа быць перабольшаны ў выхаванні дзяцей.

**Слайд 4-6.** Многія мінулыя стагоддзі сям’я добрасумленна выконвала свае функцыі. Але апошнім часам прыходзіцца сутыкацца з тым, што сям’я перастае быць асноўным выхавальнікам маладога пакалення, носьбітам сямейных традыцый і духоўнасці нацыі, яна як бы аддаляецца ад школы і перакладвае выхаванне дзяцей на настаўнікаў. Але так важна зразумець, што дзве сістэмы, сям’я і школа, павінны стварыць гармонію свайго існавання для паўнацэннага выхавання асобы, грамадзяніна. Таму для фарміравання актыўнай грамадзянскай пазіцыі вучняў, прыцягнення сям’і да жыцця школы праводзяцца святочныя мерапрыемствы разам з бацькамі і другімі дарослымі. Вечарыны, вячоркі дазволяць аб’яднаць вучняў і іх бацькоў адзіным праектам і стаць удзельнікамі. Святы і гасцёўні поплеч з сем’ямі садзейнічаюць цеснаму кантакту пакаленняў бацькоў і дзяцей, дазваляюць яшчэ раз датыкнуцца да традыцый і звычаяў беларускай сям’і. Бацькі такім чынам атрымліваюць магчымасць паўздзейнічаць канкрэтным прыкладам на выхаванне дзяцей, падвядзення іх да роздуму аб неабходнасці зберагчы маральныя каштоўнасці, набытыя старэйшым пакаленнем. Многае дае вучням і многаму вучыць завочнае падарожжа падарожжы “Мая маленькая радзіма “, дзякуючы якому мы з вучнямі атрымліваем грунтоўныя веды па гісторыі Лідчыны, вучымся сістэматызацыі і фіксуем спадчынны, самастойна падабраны матэрыял.

**Слайд 7-9.** Добрай традыцыяй нашых дзён па захаванні каштоўнасцей нацыянальнай культуры стаў музейны пакой “Вышыўка і ткацтва”, Музей папаўняецца экспанатамі і сёння, іх прыносяць вучні. Лічу, трэба заахвочваць да гэтай справы, таму традыцыйнай ладзіцца т.зв. акцыя- конкурс “Мой экспанат для музейнага пакоя”. Выставу рыхтую каментаваць вучняў-экскурсаводаў. Многія мае вучні могуць для гасцей правесці экскурсію на беларускай мове.

Хочацца прыгадаць і дадаць, што інфармацыйныя і класныя гадзіны сваім практычным і тэарэтычным зместам і матэрыялам служаць справе выхавання дзяцей на аснове народных і нацыянальных традыцый. У падрыхтоўчую работу часта ўключаюцца сем’і вучняў. На сёняшні дзень можна канстатаваць, што дзецям падабаецца, іх захапляе пачатая работа па

адраджэнні і захаванні народных традыцый. Спыняцца на дасягнутым і зробленым ніяк нельга і гэта не ўваходзіць у нашу перспектыву. **Прыкладны план працы ў накірунку “Скарбы мінулага**” Адчуванне асалоды падчас і пасля сустрэчы з мінуўшчынай – найвышэйшы паказчык адносін вучняў да гэтай патрэбнай справы па спасціжэнні багаццяў нашых продкаў, спазнанні ўкладу іх жыцця. А наша жыццё будзе доўжыцца, бо мы, настаўнікі і вучні, хочам памятаць мінулае, мы будзем ведаць нашы карані. Мінулае вучыць нас, як жыць сёння і якім можа быць заўтра. Урокі яго я называю формулай чалавечага існавання.

**Слайд 10.** З усяго вышэйсказанага можна зрабіць выснову і яшчэ раз паўтарыць, што падыходы да здзяйснення задач далучэння школьнікаў да спадчыны беларускага народа – справа надзвычай актуальная і неабходная. Рашэнне гэтай задачы дазволіць выхаваць у асяроддзі сённяшніх школьнікаў сапраўдных патрыётаў і тым самым забяспечыць надзейнае будучае нам, нашым пакаленням і нашай Радзіме.

Выхаваць грамадзяніна, патрыёта – самая пачэсная задача настаўніка, Нялёгка гэта зрабіць – умела спалучыць тэмы класных і інфармацыйных гадзін, гуртковай дзейнасці з выхаваннем грамадзянскасці, адказнасці за ўсе даручаныя справы, напоўніць жыццё клопатамі пра сябе, калектыў, краіну, Няпроста здзейсніць гэта. Аднак трэба. Бо патрабуе час і дзеці…